***Я. А. Гараднiцкi,***
*кандыдат фiлалагiчных навук*

# ЛIТАРАТУРА ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ З'ЯВА

Пры даследаваннi мастацкай лiтаратуры выкарыстоўваюцца ў асноўным два падыходы. Адзiн з iх выяўляецца ў засяроджанасцi даследчыкаў на мастацкiх вартасцях лiтаратурнага твора, якi разглядаецца як эстэтычны аб'ект. Другi ж падыход скiраваны на высвятленне сацыяльных варункаў, якiя суправаджаюць узнiкненне i функцыянаванне твора лiтаратуры. Сацыяльнае i эстэтычнае, такiм чынам, звычайна раз'ядноўваюцца ў лiтаратуразнаўчым аналiзе, выступаюць як антаганiстычныя праявы.

У адпаведнасцi з такiм размежаваннем усю гiсторыю лiтаратуразнаўчай навукi можна прадставiць як чаргаванне школ i напрамкаў, метадалогiя якiх грунтуецца на тым або iншым падыходзе. А. Андрэеў вызначае сутнасць гэтых падыходаў наступным чынам: для адных даследчыкаў лiтаратурны твор уяўляе сабой «феномен iдэй», а для другiх – «феномен мовы». «Адпаведна твор разглядаўся пераважна з пазiцый або сацыялогii лiтаратуры, або гiстарычнай паэтыкi», – заўважае даследчык. I далей пералiчвае шэраг навуковых напрамкаў, у якiх праявiлася тая або iншая метадалагiчная тэндэнцыя: «Да першых можна аднесцi "рэальную крытыку" рускiх рэвалюцыянераў-дэмакратаў XIX стагоддзя, культурна-гiстарычную, духоўна-гiстарычную, псiхааналiтычную, рытуальна-мiфалагiчную школы, марксiсцкае лiтаратуразнаўства, постструктуралiзм. Да другiх – эстэтычныя тэорыi "мастацтва для мастацтва", "чыстага мастацтва", рускую "фармальную школу", структуралiзм, эстэтычныя канцэпцыi, якiя "абслугоўваюць"мадэрнiзм i постмадэрнiзм» [1, с. 7]. Як бачым, у адным i тым жа рэчышчы лiтаратуру разглядаюць навуковыя школы, самыя розныя па сваiх метадах i даследчых устаноўках.

Для сучаснага лiтаратуразнаўства характэрна разнастайнасць навуковых метадаў i падыходаў, выкарыстоўваемых пры вывучэннi асноўнага прадмета даследавання – мастацкай лiтаратуры. Адметнасцю сучаснага навуковага дыскурсу з'яўляецца якраз тое, што, па сутнасцi, нiводзiн з гэтых метадаў i падыходаў не высоўваецца ў якасцi дамiнуючага i вызначальнага, як гэта назiралася ў мiнулым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У наш час, побач з пранікненнем у сэнсавыя глыбіні літаратурных твораў, выяўленнем іх ідэйна-светапогляднай і філасофска-маральнай вартасці, вялікае значэнне надаецца даследаванню мастацкай формы, паэтыкі, стылістыкі, асаблівасцям моўнага выражэння. Літаратура сёння ўспрымаецца перш за ўсё як адзін з відаў мастацтва. Такі падыход мае, безумоўна, станоўчае значэнне для развіцця літаратуразнаўчай навукі, удасканальвання яе даследчай метадалогіі. Разам з тым неабходна заўважыць, што ў дадзенай сітуацыі некалькі затушоўваецца сацыяльная прырода слоўнага мастацтва, менш актуальнымі ўяўляюцца сацыялагічныя метады і прыёмы даследавання літаратурнага феномена. А між тым літаратура – з'ява не толькі эстэтычная, але і сацыяльная. Яе станаўленне і функцыянаванне наогул немагчымыя па-за сферай сацыяльнага. Таму для паспяховага развіцця літаратуразнаўчай навукі надзённым з'яўляецца вырашэнне праблемы суадносін у літаратурным працэсе сацыяльнага і эстэтычнага, а таксама вызначэнне той ролі, якую выконваюць у літаратуразнаўчым даследаванні сацыялагічныя спосабы і прыёмы аналізу.

Сацыялагічна арыентаваныя літаратуразнаўчыя напрамкі і школы маюць даволі даўнюю гісторыю. Іх узнікненне і развіццё варта аднесці да XIX ст., калі фарміраваліся такія школы, як культурна-гістарычная, псіхалагічная і інш. Агульным для іх быў разгляд літаратурнага твора як эстэтычнага аб'екта, на які аказваюць уздзеянне шматлікія пазатэкставыя фактары, а менавіта гістарычная эпоха, сацыяльнае асяроддзе, у якія жывуць і дзейнічаюць героі, жыццёвыя абставіны і творчыя задумы аўтара і г. д.

На характар літаратурнага твора аказваюць адначасовае ўздзеянне шматстайныя фактары, якія адносяцца як да ўнутранай, так і да знешняй сферы яго існавання. І перш за ўсё неабходна ўлічваць вызначальную ролю аўтара ў стварэнні твора, у станаўленні яго індывідуалізаванага вобліку. Аўтарская воля, яго мастацкія інтэнцыі, жыццёвы і эстэтычны вопыт – усё гэта ў той або іншай ступені знаходзіць увасабленне ў літаратурным творы.

Хоць наяўнасць пэўнай сувязі паміж унутраным светам аўтара і мастацкім светам яго твора наогул не падвяргаецца сумненню, аднак жа яе выяўленне на практыцы ўскладняецца тым, што тут закранаецца перш за ўсё сфера псіхалогіі творчасці, у адносінах да якой па азначэнні не можа быць канчатковых і адназначных сцвярджэнняў. Даследчыкі, якія займаюцца псіхалогіяй творчасці,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

звяртаючы ўвагу на прыблізнасць і верагоднасць атрымоўваемых вынікаў даследавання ў гэтай сферы, па сутнасці, адмаўляюць жорсткую ўзаемазалежнасць паміж біяграфічнымі фактамі аўтара і ўнутранай пабудовай твора. Адзін з заснавальнікаў аналітычнай псіхалогіі, К. Юнг, які актыўна вывучаў псіхалагічную матывацыю мастацкай, у тым ліку паэтычнай, творчасці, падкрэсліваў: «Усе псіхалагічныя працэсы, якія працякаюць у межах свядомасці, яшчэ могуць аказацца каўзальна вытлумачанымі; але творчы пачатак, што карэніцца ў неабсяжнасці неўсвядомленага, вечна будзе заставацца закрытым для чалавечага пазнання» [2, с. 125].

Літаратура, з'яўляючыся адным з відаў мастацкай дзейнасці чалавека, своеасаблівым эстэтычным феноменам, у той жа час характарам свайго функцыянавання цесна злучана з соцыумам. Існаванне і развіццё літаратуры адбываецца ў выглядзе перманентнага працэсу, у якім прымае ўдзел вялікая колькасць складнікаў. Гэта абумоўлена тым, што стварэнне, узнаўленне і захаванне велізарнай колькасці тэкстаў, якія ўваходзяць у корпус кожнай нацыянальнай літаратуры, патрабуе прыкладання значных намаганняў, задзейнічання многіх механізмаў культуратворчага характару.

Паколькі асноўнае звяно літаратурнага працэсу – твор мастацкай літаратуры – уяўляе сабой спецыфічны артэфакт, прадукт як духоўнага, эстэтычнага, так і практычна-матэрыяльнага паходжання, то пры яго вытварэнні сацыяльна-эканамічныя фактары маюць істотнае значэнне.

На гэты бок літаратурнага працэсу звярталася заўсёды значна менш увагі, чым на вывучэнне спосабаў увасаблення ў творы вобраза чалавека і абставін яго жыцця. Таму правядзенне даследаванняў у дадзеным кірунку ўяўляецца нам перспектыўным, адкрываючым новыя магчымасці ў спасціжэнні прыроды літаратурнай творчасці.

Літаратура не толькі раскрывае сацыяльна значымыя сітуацыі і адносіны ў мастацка выяўляемай рэчаіснасці, але сама становіцца аб'ектам уздзеяння сацыяльна абумоўленых тэндэнцый. Такім чынам, літаратура з'яўляецца адначасова і суб'ектам, і аб'ектам у дачыненні да рэальнасці, якая, з аднаго боку, прадстае ў творы як рэферэнтная, па-мастацку ўвасобленая і эстэтычна пераасэнсаваная аўтарам рэальнасць, а з другога – як рэальнасць, якая спараджае эстэтычныя аб'екты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследчыкамі гісторыі беларускай літаратуры пачатку XX ст. слушна адзначаецца пашырэнне абсягу функцыянавання новай беларускай літаратуры, яе дэмакратычны характар, арыентаванасць на масавага чытача. Разам з тым адзначым, што літаратуразнаўствам недастаткова ўвагі надавалася да гэтага часу сацыяльным даследаванням іншага плану. Не ў дастатковай ступені вывучана поле культурнага тварэння, у якім паўстаюць і функцыянуюць літаратурныя творы. Тлумачыцца гэта тым, што пачынаючы з 1930-х гг. традыцыі сацыяльнага вывучэння літаратуры ў савецкай літаратуразнаўчай навуцы былі амаль што перарваныя. І ў пазнейшы час, у другой палове XX ст., да сацыялогіі ў дачыненні да мастацтва адносіліся даволі насцярожана. Часцей за ўсё само паняцце *сацыялогія*, калі гаворка вялася пра літаратуру, ужывалася ў выразе *вульгарная сацыялогія,* ад яго ўтваралася вытворнае *сацыялагізатарства*, г. зн. кантэкстуальнае ўжыванне гэтага паняцця мела ў асноўным адмоўнае значэнне і канатацыйныя сэнсы, якія яно спараджала, не спрыялі выпрацоўцы даверу да метадалогіі сацыялагічнага даследавання ў галіне літаратуразнаўства.

Між тым вывучэнне ўмоў узнікнення, спосабаў функцыянавання і ўзнаўлення літаратурных твораў, чым займаецца сацыялогія літаратуры, складае вельмі істотную частку прадмета літаратуразнаўчага даследавання. У наш час існуе пільная патрэба больш шырокага, шматбаковага погляду на сацыялогію літаратуры, на сацыялагічныя метады даследавання. Паколькі сацыялогія – гэта не толькі пошукі аналогій паміж светам мастацкага твора і соцыумам, станам грамадскага развіцця, інтарэсамі тых або іншых груп насельніцтва. У сучасным разуменні задач сацыялагічнага даследавання мастацтва на першы план выходзяць аналіз умоў, пры якіх становіцца магчымым само існаванне мастацкага феномену, пастаяннае ўзнаўленне мастацкіх вартасцей.

У сучасных умовах няпростага існавання літаратуры ўзрастае значэнне яе сацыяльнай адаптацыі, паўнейшага выкарыстання сродкаў духоўнага, маральнага і эстэтычнага ўздзеяння на грамадства. Умацаванню сацыяльнай базы літаратурнай творчасці, больш эфектыўнаму функцыянаванню літаратуры ў якасці аднаго з сацыяльных інстытутаў павінна садзейнічаць выпрацоўка літаратуразнаўчай метадалогіі даследавання і прагназавання спосабаў уваходжання сучаснай літаратуры ў агульны сацыякультурны кантэкст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Андреев, А. Н.* Теория литературы : в 2 ч. / А. Н. Андреев. – Минск : Изд-во Гревцова, 2010. – Ч. 1. Художественное произведение. – 284 с.

2. *Юнг, К. Г.* Собр. соч. : в 19 т. / К. Г. Юнг. – М. : Ренессанс, 1992. – Т. 15. Феномен духа в искусстве и науке. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ